# Самазаспакоенасць—не наш дэвіз


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (543) Субота, 23 лістапада 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы


## XVIII камсамольская канферэнцыя

У нядзелю ў актавай зале галоўнага корпуса адбылася XVIII камсамольская канферэнцыя. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі: сакратар Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі Р. С. Піонава, сакратар Мінскага прамысловага абкома ЛКСМБ І. М. Пермякова, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна А. Н. Сеўчанка, прарэктар БДУ імя У. І. Леніна па навуковай рабоце В. І. Сцяпанаў, сакратар партыйнага камітэта універсітэта Т. Я. Дударава, старшыня мясцовага камітэта універсітэта Ц. Е. Саладкоў, старшыня прафсаюзнага камітэта універсітэта У. П. Кеда.

На канферэнцыі са справаздачным дакладам выступіў сакратар камітэга камсамола універсітэта Г. Я. Рылюк.

У парадку дня канферэнцыі стаялі чатыры пытанні: 1. Справаздача камітэта камсамола. 2. Справаздача рэвізійнай камісіі. 3. Выбары камітэта камсамола. 4. Выбары рэвізійнай камісіі.

Даклад сакратара камітэта камсамола універсітэта Георгія Рылюка быў прысвечаны аналізу работы камсамольскай арганізацыі за год, што прайшоў пасля папярэдняй, XVII канферэнцыі.

Галоўную ўвагу Г. Рылюк удзяліў аналізу палітыка-выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта камсамола. У мінулым годзе вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў карысталіся універсітэты культуры, сёлета працуюць лекторыі па мастацтву і музыцы. Сумесна з таварыствам «Веды» камітэт камсамола арганізаваў дыскусійны клуб «Ведаць, шукаць, змагацца», першае пасяджэнне якога ўжо адбылося. Цяпер рыхтуюцца да правядзення чарговых дыспутаў фізікі, географы, біёлагі, матэматыкі.

Сакратар камітэта прааналізаваў таксама работу іншых сектараў: культурна-масавай работы, навуковай, шэфскай, піянерскай, спартыўнай работы, работы добраахвотнай народнай дружыны. Але найбольш важны ўчастак камсамольскага жыцця — вучоба — не знайшоў сапраўднага асвятлення ў справаздачным дакладзе. Між тым прыведзеныя ў дакладзе лічбы непаспяховасці ва універсітэце і на асобных факультэтах павінны былі выклікаць сур'ёзнае рэагаванне — трэба было больш удумліва прааналізаваць прычыны дрэннай паспяховасці на фізічным факультэце, на хімічным, матэматычным факультэтах. Між тым увага дакладчыка, а потым і выступаўшых у спрэчках дэлегатаў не спынілася надоўга на такім адказным пытанні. А той жа факт, што з кожнай 1000 студэнтаў 64 атрымалі нездавальняючыя адзнакі, не робіць нам гонару.

Слоў няма, універсітэцкая камсамольская арганізацыя мае на сваім ліку шмат добрых, нават выдатных спраў. Узнагароджанне цаліннага будаўнічага атраду памятным Чырвоным Сцягам, вялікія поспехі ў вучобе пераважнай большасці студэнтаў, добра арганізаваная палітыка-выхаваўчая работа— усё гэта радуе. Шмат аб гэтым гаварылася і на канферэнцыі— у дакладзе, у выступленнях дэлегатаў.

Але чамусьці не ўзнікла сур'ёзная размова аб недахопах, аб прычынах іх узнікнення ў нас, аб спосабах іх ліквідавання. Нават пасля таго, як асобныя дэлегаты выказвалі трывогу, напрыклад, аб становішчы, якое склалася ў мастацкай самадзейнасці універсітэта, не ўзнікла гаворка аб выпраўленні недахопаў у рабоце народнай харавой капэлы, танцавальнага калектыву і іншых калектываў самадзейнасці.

Не з усёй адказнасцю аднесліся да ўдзелу ў рабоце канферэнцыі асобныя сакратары камсамольскіх арганізацый факультэтаў. Толькі два сакратары, што працавалі ў мінулым годзе — Стражаў і Сяліцкі,— выступілі ў спрэчках. А што ж астатнія? Ці ў іх арганізацыях усё так бліскуча? Не.

Яшчэ адзін важны участак работы камсамольскай арганізацыі — работа студэнцкага навуковага таварыства — не быў абмеркаваны дэлегатамі. Чаму? Не дазволіў рэгламент канферэнцыі. Зразумела, права дэлегатаў — дазволіць ці не выступаць прамоўцы, але незразумела, чаму прадстаўніку СНТ не далі слова.

Канешне, за адзін дзень работы канферэнцыі нельга паспець абмеркаваць усе бакі камсамольскага жыцця універсітэта. І таму камітэту камсамола трэба яшчэ больш сур'ёзна працаваць над вырашэннем праблем, паўстаючых перад камсамольскай арганізацыяй. З кожным годам змяняюцца канкрэтныя задачы. Падыходзячы з усёй адказнасцю да вырашэння іх, заўсёды можна паспяхова справіцца з імі.. Самазаспакоенасць — не наш дэвіз.

Сёлета камсамольская арганізацыя мае перад сабой тры новых задачы. Першая: актыўны ўдзел ва ўсенароднай барацьбе за развіццё хіміі і хімічнай прамысловасці. Асабліва гэта датычыцца да студэнтаў хімічнага факультэта... Улетку на будоўлях цаліны працавалі амаль трыста студэнтаў універсітэта. Наступныя канікулы на цаліне правядуць прыкладна 500—600 маладых будаўнікоў. Падрыхтоўка да стварэння студэнцкіх будаўнічых атрадаў павінна пачынацца ўжо цяпер... Трэцяя задача — аказанне дапамогі універсітэцкай камсамольскай арганізацыяй у развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі, шэфства над найбольш адстаючымі гаспадаркамі рэспублікі. Няма сумнення, універсітэцкая камсамолія з гэтымі задачамі справіцца.

## Састаў камітэта камсамола

XVIII агульнауніверсітэцкая камсамольская канферэнцыя абрала новы састаў камітэта камсамола БДУ.

На арганізацыйным пасяджэнні камітэта камсамола абавязкі паміж яго членамі размеркаваліся такім чынам:

Георгій РЫЛЮК — сакратар камітэта камсамола.
Іван ШОРАЦ (4 курс гістфака) — намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце.
Аляксандр КУХАРАЎ (2 курс юрфака) — намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце.
Мікалай СТАШКЕВІЧ (2 курс гістфака),
Віктар СІРАЖ (2 курс юрфака),
Леанід КРАСУЛЕВІЧ (3 курс біяфака) — адказныя за палітыка-выхаваўчую работу.
Іван АКІНЧЫЦ (4 курс гістфака) — адказны за работу акадэмічнага сектару.
Джэмма ШОХАН (4 курс аддз. журналістыкі) — адказная за навуковую работу.
Марыя КАРДЗЮКОВА (4 курс аддз. беларускай мовы і літаратуры),
Эдуард ЗЕНЬКЕВІЧ (2 курс фізфака)—адказныя за шэфскую работу.
Пётр ЕРАШКЕВІЧ (4 курс юрфака).
Леанід МАКАЁНАК (3 курс юрфака) — адказныя за культурна-масавую работу.
Тацяна АЗАРАВА (1 курс матфака) — адказная за арганізацыйную работу.
Галіна КАВАЛЁВА (1 курс хімфака) — адказная за піянерскую работу.
Міхаіл САРОКІН (4 курс матфака).
Уладзімір ЛАЎРУКОВІЧ (асістэнт кафедры радыёфізікі і электронікі) — адказныя за работу народнай дружыны.
Іосіф БЕЛЬКОВІЧ (3 курс гістфака) — адказны за арганізацыю працы і адпачынку студэнтаў.
Іван ГУРЫН (2 курс фізфака) — адказны за спартыўна-масавую работу.
Генадзій БАЖОК (2 курс фізфака) — адказны за работу інтэрнацыянальнага сектару.
Ніна КАСЦЮКОВІЧ (4 курс геафака)—адказная за работу школы грамадскіх прафесій.

# КУРС—НА ЗІМОВУЮ СЕСІЮ

Непрыкметна праходзяць дні, тыдні, месяцы... Восемдзесят дзён навучальнага года.

Восемдзесят дзён... Гэта і мала, і многа. Мне хочацца падзяліцца сваімі думкамі аб мінулым, аб цяперашнім і аб будучым. Наперадзе ж — зімовая экзаменацыйная сесія. Яна усё ўлічыць і спытае, чаму мы навучыліся...

Мінулае—лета — прайшло... Шмат добрых успамінаў аб ім засталося ў нашай памяці. І ці не таму мае сябры-студэнты з такім стараннем узяліся за вучобу?! Кнігі, канспекты, лекцыі. У некаторых — лабараторныя работы, «курсоўкі».

Не па асобаму заданню, не з нейкай цікавасці я ўвайшла ў чытальную залу нашай бібліятэкі. Мне хацелася ведаць, як студэнты ўжо сёння бяруць прыцэл на зімовую сесію, хто ўжо стаў на рэйкі падрыхтоўкі да яе. а хто яшчэ не. Вядома ж, без падрыхтоўкі і вераб'я не саб'еш. Падрыхтоўка патрэбна ўсюды...

Чытальная ледзь не да адказу запоўнена студэнтамі. Ва ўсіх — заклапочаныя твары. Прыслухаешся і чуеш ледзь прыкметны шорах старонак. Цішыня незвычайная. Да закрыцця чытальнай залы застаецца ўсяго некалькі хвілін, а займаюцца больш васьмідзесяці чалавек. І не бачна, каб хто-небудзь ужо збіраўся выходзіць. Проста студэнты занятыя сваёй справай і на позні час не звяртаюць увагі.

Я падыйшла да двух дзяўчын. Гэта першакурсніцы біялагічнага факультэта. Валя Анфінагенава і Жана Бурмістрава пасябравалі ўжо ў час здачы ўступных экзаменаў. Ім спадабалася прафесія біёлага. Аб ёй яны марылі яшчэ з дзяцінства, за школьнай партай.

У той вечар Валя і Жана рыхтаваліся да практычных заняткаў па вышэйшай матэматыцы.

— Удваіх куды лягчэй займацца, — гаворыць Валя, — лепш засвойваеш пройдзены матэрыял. Так мы практыкавалі некалі ў школе. Адзін што-небудзь забудзе — другі дапаможа ўспомніць.

За другім столікам схіліліся над падручнікамі англійскай мовы студэнты хімфака—другакурсніца Ніна Корхава і чацвёртакурснік Мікалай Сыцін.

— Мікола вельмі многа дапамагае мне ў падрыхтоўцы да заняткаў па мове. Ледзь што-небудзь не зразумею— адразу звяртаюся да яго. Ведаю: ён ніколі не пашкадуе ні часу, ні сіл... Так жа і па іншых прадметах. Назаву я няправільна формулу або працэс рэакцыі няверна раскажу — Коля адкладзе свае справы і прымецца мне растлумачваць. Дзякуючы яму я многае ў сваіх ведах выправіла, глыбей засвоіла матэрыял, — расказвае Ніна.

У гутарку ўступае і Мікалай. Ён гаворыць, што яны заўсёды займаюцца ў гэтай зале, бо тут утульна, прасторна — лепшай у горадзе не знойдзеш. І за некалькі мінут можна атрымаць неабходную літаратуру.

Мікалай расказаў, што ён пачаў рыхтавацца да дзяржаўнага экзамена па англійскай мове і дапамога Ніне дапамагае і яму лепш успомніць тое ці іншае пытанне.

Акрамя «чыталкі», я пабывала і ў інтэрнаце. Там нечакана пазнаёмілася з юнакамі з Танганькі. Дамінка Клемента Муджахузі і Кайзу Джусціна — яшчэ не студэнты. За адзін месяц вучобы на падрыхтоўчых курсах яны хоць не вельмі добра, але авалодалі рускай мовай. Выкладчыкі і студэнты, якія навучаюць іх, бачуць іх вялікую любоў да працы, упартасць, настойлівасць.

А з Аняй Саладуха, Верай Грышаль, Тамарай Азіновіч, Людай Лубнінай і Яняй Сіповіч мы сустрэліся у пакоі № 8 першага інтэрната. За сталом, заваленым кнігамі, адна дзяўчына чытала, другая пісала, а трэцяя, трымаючы паўраскрытую кнігу ў руцэ, слухала Першы канцэрт Чайкоўскага. На вокладцы кнігі — назва. «Палітычная эканомія».

— Рыхтавалася да заняткаў... Але... Чайкоўскі. Заслухалася. Ведаеце, музыка нават дапамагае, лягчэй засвойваецца матэрыял, — усміхнулася Аня. — Да зімовай сесіі рыхтуемся па ходу заняткаў. Мы ўсе — трэцякурсніцы фізфака. Адны рыхтуюцца да лабараторных заняткаў, а Тамара — вывучае нямецкую...

— Сёння мы ўсім пакоем ідзём у кіно. Так мы заўсёды робім у панядзелак. Ходзім на апошнія сеансы, бо так застаецца больш часу. Вельмі ўжо добра вяртацца дамоў разам позна ўвечары, ведаючы, што на заўтра ў цябе ўсё гатова,— дадае Тамара.

Улетку некаторыя з дзяўчын адпачывалі дома, другія — падарожнічалі. Вера ездзіла на цаліну, працавала ў будаўнічай брыгадзе.

Мяне радавала, што, закончыўшы свой «рэйд» і падвёўшы вынікі, пераконваешся: большасць студэнтаў сур'ёзна рыхтуецца да заняткаў і асабліва да экзаменацыйнай сесіі. Хто ж з нас не хоча здаць яе паспяхова? А тым, хто яшчэ раскачваецца, пажадаю аднаго — спяшайцеся, сесія, як гавораць студэнты, не за гарамі.

Святлана КУРЫЛЬЧЫК,

студэнтка 3 курса вяч. аддз. журналістыкі.

## Універсітэт за тыдзень

* * *

На пятым курсе гістарычнага факультэта пачаліся экзамены. У двух групах гісторыю БССР здавалі 34 студэнты. Сем з іх адказвалі выдатна, астатнія атрымалі добрыя адзнакі.

«Пяцёркі» атрымалі С. Благуш, Н. Нерабеева, В. Макарэвіч, Т. Любко і іншыя.

Напярэдадні экзамена выпускнікі гістфака здалі тры залікі.

* * *

Выйшаў чарговы нумар насценгазеты «Шашыст універсітэта». Нумар расказвае аб спаборніцтвах, у якіх удзельнічалі шашысты ў апошні час, аб задачах, што стаяць цяпер перад шашачным клубам універсітэта.

* * *

Бюро літаб'яднання газеты «Во славу Родины» запрашае універсітэцкіх паэтаў і празаікаў на заняткі літаб'яднання, якія адбудуцца заўтра ў Доме афіцэраў. Будуць абмяркоўвацца апавяданні В. Майстрова «З полымем жартаваць нельга» і І. Карніенкі «Аганёк». Пачатак а 12 гадзіне.

## З XVIII-й камсамольскай канферэнцыі

# Слова—дэлегатам

★ ★ ★

**Я. СЯЛІЦКІ,**

**(член камсамольскага бюро філфака).**

Шмат добрага зрабілі нашы студэнты ў мінулым годзе, але на гэта добрае кладзецца цень дрэннага. Вось аб гэтым я хачу сказаць некалькі слоў.

У кожнай групе ёсць прафоргі, групкамсоргі, старасты, актывісты. Але працуюць пераважна толькі камсамольскія важакі. Часта прафоргі абмяжоўваюцца зборам членскіх узносаў, а старасты— прастаўленнем у журналах пропускаў студэнтамі занятказ. Групкамсоргі ж падыходзяць да рашэння той ці іншай справы без іх дапамогі.

Камсоргі павінны ведаць аб сваіх аднакурсніках літаральна ўсё. А у нас часам не ведаюць не толькі таго, чым чалавек жыве, але і дзе ён жыве. Быў жа такі выпадак на факультэце: калі з адной нашай студэнткай адбылося здарэнне і сталі высвятляць прычыны яго, аказалася, што ніхто нічога не ведаў аб ёй, нават яе сяброўка, якая жыла побач два гады.

Некалькі слоў папроку ў адрас камітэта камсамола БДУ. Вельмі слаба былі звязаны сектары камітэта з жыццём нашых факультэтаў. Рэдка прыходзіла яго канкрэтная дапамога ў рабоце факультэцкай арганізацыі філфака.

**І. МЫСЛІВЕЦ,**

**(член прафкома геафака).**

Нас, географаў, натуральна, больш за ўсё цікавіць геаграфія. Але гэтага не ўлічваюць пры правядзенні падпіскі на газеты і часопісы. Слоў няма, чытаць і выпісваць перыядычныя выданні павінен кожны. Аднак мы жадаем быць у курсе падзей не толькі палітычных, але таксама і геаграфічных. Нашаму ж факультэту, на якім навучаецца больш 250 студэнтаў, запланавалі толькі лічаныя адзінкі такога часопіса, як «Вокруг света». Пажадана, каб пры падпісцы ўпаўнаважаныя лепей улічвалі спецыфіку кожнага факультэта.

**В. СТРАЖАЎ,**

**(нам. сакратара камсамольскай арганізацыі фізфака).**

Студэнтаў-фізікаў справядліва папракаюць у дрэннай паспяховасці. Зразумела, на фізфаку вучыцца вельмі цяжка. Некаторыя не вытрымліваюць і кідаюць вучобу, пераводзяцца на іншыя факультэты, у іншыя ВНУ. Але часта незадавальняючыя адзнакі з'яўляюцца ў залікоўках з-за гультайства. Калі настойліва вучыш прадмет, заўсёды его будзеш ведаць.

Мне здаецца, галоўныя прычыны непаспяховасці ўсё ж у нас у наступным: у дрэннай сувязі асобных выкладчыкаў са студэнтамі, у абыякавасці да вучобы і пасіўнасці пэўнай часткі студэнтаў, у слабым кантролі за паспяховасцю і наведваннем заняткаў з боку дэканата і камсамольскай арганізацыі. Акрамя таго, малодшакурснікі яшчэ не ўмеюць планаваць свой час.

Трэба студэнтам старэйшых курсаў дапамагчы першакурснікам у вывучэнні асабліва цяжкіх прадметаў.

**Л. СУШКЕВІЧ,**

**(старшыня праўлення клуба універсітэта).**

Некалькі часу прайшло пасля прыняцця партыйным камітэтам пастановы аб шырокім уцягненні ў мастацкую самадзейнасць студэнтаў 1—3 курсаў, але да гэтага часу толькі асобныя факультэты выконваюць рашэнне: хімічны, гістарычны, матэматычны. Фізічны жа факультэт яшчэ не выдзеліў найбольш здольных сваіх прадстаўнікоў у мастацкую самадзейнасць універсітэта. Кіраўнікі факультэта дагэтуль толькі абяцаюць.

У апошні час сутыкнуліся дзве сілы: агульнауніверсітэцкая і факультэцкая мастацкая самадзейнасць. І гэта ў той час, калі паміж імі павінна быць самая цесная і моцная творчая сувязь. Мы не павінны мірыцца з нежаданнем факультэцкіх калектываў выдзяляць сваіх лепшых прадстаўнікоў у агульнауніверсітэцкую самадзейнасць, бо развіццё яе — наша агульная справа. Чым больш будзе прыходзіць студэнтаў ва універсітэцкую самадзейнасць, тым лепш будуць працаваць нашы творчыя калектывы.

Трэба адзначыць, што прафсаюзная арганізацыя БДУ, у адрозненне ад партыйнай і камсамольскай, мала ўвагі ўдзяляе самадзейнасці. Прафком мае грашовыя сродкі, але недастаткова дапамагае ў матэрыяльным забеспячэнні гуртоў мастацкай самадзейнасці.

Вялікі папрок трэба сказаць і ў адрас адміністратыўна-гаспадарчай часткі. У наяўнасці ёсць шмат касцюмаў, дэкарацый, а захоўваць іх няма дзе, і ляжаць яны ў скрутках, у дрэнных памяшканнях і, зразумела, псуюцца. Дрэнна ў нас яшчэ і з забеспячэннем памяшканнямі для рэпетыцый. Часта самадзейныя артыстаў ганяюць з пакоя ў пакой. Дзе ўжо тут да добрай падрыхтоўкі! Адміністратыўна-гаспадарчай частцы трэба падумаць аб гэтым.

**В. ЛАШЧЫНІН,**

**(член праўлення клуба БДУ).**

Сярод нашых студэнтаў ёсць некаторая частка тых, хто нічога, акрамя вучобы не жадае рабіць. Ён не ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. Пры паступленні ж ва ВНУ кожны стараецца ў сваёй аўтабіяграфіі падкрэсліць, што ён і артыст, і чэмпіён, і вялікі грамадскі дзеяч. Калі ж справа даходзіць да ўдзелу, напрыклад, у мастацкай самадзейнасці, то «артыстаў» днём з агнём не знойдзеш.

Здольныя студэнты ў нас ёсць. Але камітэты камсамола яшчэ мала працуюць з людзьмі. Мастацкая самадзейнасць пагражаючa пагаршае сваю работу. Развальваецца драматычны калектыў, танцавальны ансамбль, народная харавая капэлла. Трэба тэрмінова прынімаць нейкія меры.

**М. А. ШЭЙНЕМАН,**

**(выкладчык кафедры фізвыхавання).**

На будаўніцтве універсітэцкага стадыёна зроблена многае, але пры добрым кіраўніцтве можна было б зрабіць яшчэ больш. Камітэт змог згуртаваць вакол сябе калектыў, але будаўніцтвам стадыёна недастаткова займаўся, асабліва яго малодшыя памочнікі — факультэцкія камітэты.

Шэфскі сектар камітэта камсамола мала ўдзяляў увагі спартклубу. Зрабілі некалькі выездаў у калгасы з мастацкай і спартыўнай самадзейнасцю, але на гэтым справа спынілася. Цесная сувязі з сельскімі калектывамі не атрымоўвалася. У новым саставе камітэта камсамола ў спартыўным сектары павінен быць больш актыўны таварыш.

* * *

*У спрэчках выступілі таксама сакратар партыйнага камітэта Г. Я. Дударава, рэктар Беларускага дзяржуніверсітэта А. Н. Сеўчанка, студэнты Мелех (фізфак), Шкаруба (хімфак), Сакові (фізфак) і іншыя.*

# Фізкультура і спорт

## Мінск—Каўнас

**СУСТРЭЧЫ СТАНУЦЬ ТРАДЫЦЫЙНЫМІ**

Нас 18. Гэта — жаночая і мужчынская каманда універсітэта па валейболу. Мы едзем ў Каўнас на таварыскія сустрэчы са спартсменамі мясцовага політэхнічнага інстытута.

У дарозе час ляціць непрыкметна. Нястомна пачынае песню за песняй Віктар Максіменка (5 курс фізфака), выбухі смеху выклікаюць трапныя жарты яго аднакурсніка Мікалая Сасімовіча. Так праходзіць шлях да Каўнаса. А там нас сустракаюць прадстаўнікі кафедры фізвыхавання інстытута, у тым ліку старшыня секцыі валейболу Андрус Продас.

Раніцу наступнага дня мы прысвяцілі знаёмству з мясцовым музеем, са старажытнымі помнікамі. Нас доўга водзяць па політэхнічнаму інстытуту, знаёмячы з ім, з яго спартыўнай базай.

Цікава, што стадыён інстытута, які ўмяшчае дзве тысячы гледачоў, студэнты пабудавалі ўласнымі рукамі. Тут ёсць бегавыя дарожкі, сектары для прыжкоў, раздзявалкі, душавыя.

А ўвечары—гульні. Нам расказалі, што мы першыя прадстаўнікі мінскіх студэнтаў-спартсменаў у Каўнасе, у горадзе, славутым спартыўнымі традыцыямі. І нам вельмі хацелася не падвесці беларускіх студэнтаў.

Было над чым прызадумацца і нашаму трэнеру Анатолію Іванавічу Яфімаву! У абноўленым складзе мы, па сутнасці, выступалі ўпершыню. А жаночая каманда амаль поўнасцю складаецца з першакурсніц. І ім прадстаяла сур'ёзнае выпрабаванне. Жаночая ж каманда КПІ — неаднаразовы пераможац першынства Літоўскай ССР!

Нашы дзяўчыны змагаліся з імянітымі суперніцамі на роўных. Лік ідзе ачко ў ачко. І толькі нявопытнасць нашых спартсменак перашкаджае ім закончыць сустрэчу ў сваю карысць. Яны прайгралі—0:3, але лік партый гаворыць сам за сябе—13:15, 13:15, 12:15.

З першых жа удараў па мячу ў сустрэчы мужчынскіх каманд стала бачна перавага нашых хлопцаў. І гэта не здзіўляюча. У складзе нашай каманды—члены зборнай рэспублікі, удзельнікі III Спартакіяды народаў СССР Канстанцін Навумік (3 курс хімфака) і Юрый Васільеў (2 курс фізфака). Сёлета ў каманду прыйшло добрае папаўненне, і лепшы з навічкоў—Сяргей Хахлюк, студэнт І курса фізфака. Каманда іграе дружна, упэўнена. Як заўсёды, удаюцца моцныя ўдары Навуміку. Карысна дзейнічае ў нападзенні і абароне Васільеў. Часта дасягаюць мэты ўдары выпускніка геафака Міхаіла Васкрасенскага. Шмат працуе наш разыгрываючы Мікола Сасімовіч. Перамога за намі — 3:1 (15:8, 11:15, 15:7, 15:12).

Мы пакідалі Каўнас у добрым настроі. Але не назаўсёды развіталіся са сваімі новымі сябрамі: кіраўнікі нашых спартыўных дэлегацый дамовіліся, што сустрэчы паміж спартсменамі абедзвух ВНУ стануць традыцыйнымі.

**Георгій БУГРЫМ.**

## Ганаровы пройгрыш філолагаў

У сераду пачалося першынство універсітэта па шашках. Удзельнічаюць каманды факультэтаў, акрамя юрыдычнага, і вылічальнага цэнтра. У кожнай камандзе — па 8 спартсменаў.

У першым туры сустрэліся асноўныя прэтэндэнты на першае месца — фізікі і матэматыкі. Вялікую цікавасць выклікалі паядынкі Маісеенка — Струк і Хапалюк—Соркіна. У абедзвух сустрэчах перамога аказалася на баку матэматыкаў. З усёй каманды фізікаў толькі Берташ заваяваў паўачка. У выніку—паражэнне фізікаў з лікам 0,5:7,5. Хімікі блiскуча перайгралі географаў — 6,5: 1,5 і зрабілі сур'ёзную заяўку на прызавое месца.

Добра выступіла каманда філолагаў супраць каманды вылічальнага цэнтра, у якой у асноўным — першаразраднікі і кандыдаты ў майстры. Лік 4,5:3,5 у карысць каманды вылічальнага цэнтра. Сустрэча біёлагаў з гісторыкамі перанесена.

**Г. Драбушэвіч.**

*Выходзіць чарговы нумар вучэбнай газеты «Журналіст», падрыхтаваны студэнтамі 4 курса вячэрняга аддзялення журналістыкі.*

*Мы змяшчаем сёння фельетон, які будзе надрукаваны ў гэтым нумары.*

# „Свяцілы“ ў выцвярэзніку

*Фельетон*

«Перш чым авалодаць
якімі-небудзь вышынямі,
навучыся валодаць сабой».

**В. Жамчужнікаў.**

Трагікамедыя
ў 2-х дзеях

*

*ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:*

Нічыпаронак Леанід.
Міхееў Рыгор — студэнты матфака БДУ.
Дзяжурны міліцыянер.
Дружыннікі.
Урач.

### Дзея першая

*За сталом сядзяць Нічапаронак Л. і Міхееў Р. Яны толькі што выпілі па першай чарцы.*

НІЧЫПАРОНАК *(весела)*: Калі адкінеш у бок сумныя «фаліянты», напоўненыя чалавечай мудрасцю, жыццё здаецца больш светлым.

МІХЕЕЎ *(неазначальна)*: Т-а-к...

*(Пауза).*

НІЧЫПАРОНАК: Калі што і выратоўвае мяне ад канчатковай апатыі, дык гэта думка аб тым, што хутка атрымаем дыпломы і... фюць у дарогу.

МІХЕЕЎ: Будзем сціпла служыць на ніве народнай асветы.

НІЧЫПАРОНАК: Вось, вось... Навука...

МІХЕЕЎ: Навука, брат, патрабуе ахвяр. Запальваць свяцільнік розуму... Э, ды што там... Вып'ем?

НІЧЫПАРОНАК: Вып'ем. У навукі няма шырокай стаўбавой дарогі. А шкада... Я люблю хадзіць па шырокай.

*(П'юць).*

МІХЕЕЎ *(закусваючы)*: Эліксір. Немагчыма паверыць, што ў гэтай вадкасці столькі жыццёвага цымусу.

НІЧЫПАРОНАК: А між іншым гэта так. Жыццёвы цымус... Добра сказана. Ты мудры, як Саламон. За мудрасць, калега! *(Чокаюцца)*. За мудрасць, якая робіць людзей вольнымі, як птушкі.

МІХЕЕЎ: Так. Людзям высокага інтэлекту калі-ні-калі карысна забыцца: гэта ачышчае. Нават неабходна. Забудземся ж сёння, каб заўтра зноў загарэцца неадольным пачуццём.

НІЧЫПАРОНАК: Вы... вып'ем... загарымся...

МІХЕЕЎ: ...пачуццём людзей, ахвяруючых...

НІЧЫПАРОНАК: Я ахвярую. *(Дастае з кішэні грошы, кладзе на стол)*. Ахвярую, каб загарэцца...

МІХЕЕЎ: Мы ахвяруем *(стукае аб стол)*, каб служыць на ніве...

НІЧЫПАРОНАК: Мудр, бестыя... Мудрасць — сонца чалавецтва! Гэта табе не Дэкартава сістэма каардзінат. Добра, чорт вазьмі, адчуваць, што і ты — нейкая крупіца свяціла.

МІХЕЕЎ *(захапляюча)*: Я — крупіца свяціла. *(Нічыпаронку)*. Ты адкрыў мне вочы... Але я нічога не бачу. Цёмна... *(схіляецца на стол).*

### Дзея другая

*Выцвярэзнік. Апоўнач. Адчыняюцца дзверы, і дружыннікі ўводзяць Нічыпаронка.*

НІЧЫПАРОНАК: Варвары! Вы яшчэ будзеце... як гэта... раскайвацца.

ДЗЯЖУРНЫ МІЛІЦЫЯНЕР: Адкуль прывялі?

ДРУЖЫННІК: З вуліцы Кірава. Скора прывядзём яшчэ аднаго.

*(Знікаюць).*

ДЗЯЖУРНЫ МІЛІЦЫЯНЕР: *(па тэлефоне)*: Перадайце ўрачу, што ёсць пацыент. Пакуль што адзін. *(Кладзе трубку).*

НІЧЫПАРОНАК *(б'е сябе ў грудзі)*: Вы ведаеце, хто я? Не ведаеце?.. Мы прызначаны, каб кідаць іскры святла... на ніве... *(Махае рукой)*. Э, усёроўна не разумееш. *(Моцна)*. У гэтым твая трагедыя.

*Уваходзіць урач.*

УРАЧ *(Нічыпаронку)*: Як жа цябе развязло... Сапраўды — трагедыя.

НІЧЫПАРОНАК: Я — свяціла. Іскра ў цемры...

УРАЧ *(да міліцыянера)*: Запішыце, калі ласка, у акце: «Запах алкаголю з рота вельмі адчувальны, на нагах трымаецца слаба, у акружаючым асяроддзі і часе не арыентуецца...»

*Дружыннікі прыводзяць Міхеева.*

МІХЕЕЎ: Мы вывучаем Эйнштэйна, а вы вядзеце нас. Куды вядзеце?...

НІЧЫПАРОНАК: Раскаецеся, варвары... чэрствыя душы...

МІХЕЕЎ: Фу, ты, д'ябал, знаёмы голас... *(Указвае на Нічыпаронка)*. Знаёмая фізіяномія... Падобны на ... Эйнштэйна.

ДЗЯЖУРНЫ МІЛІЦЫЯНЕР: *(дружыннікам)*: Адвядзіце іх.

НІЧЫПАРОНАК: Вы... невукі. Я буду вас вучыць... Рыгор, іх, іх патрэбна аслабаніць ад невуцтва... Сам лёс усклаў гэту місію на мяне. *(Пачынае буяніць. Дружыннікі ўціхаміраваюць Нічыпаронка).*

МІХЕЕЎ: Мы вывучаем Эйнштэйна. Ён са мной выпіваў.

НІЧЫПАРОНАК *(крычыць)*: Пусціце мяне!.. Пусціце!..

МІХЕЕЎ *(задумённа)*: Дзе ж я яго бачыў? Знаёмы тып...

*Абодвух выводзяць.*

ДЗЯЖУРНЫ МІЛІЦЫЯНЕР: *(запісвае)*: «У сувязі з праяўленнем буйных дзеянняў гр-ну Нічыпаронку Л. П. прыменена ўсміральная сарочка».

Ул. МІХАЙЛАЎ

Рэдактар М. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10582. Тыр. 2000. Зак. 4317